*Раім прачытаць*

# Выбраннікі народа

З вялікай цікавасцю сустрэлі чытачы кнігу Старшыні Прэзідыума Вярхоўнага Савета Беларускай ССР В. І. Казлова **«Разам з масамі, пад кантролем мас»**, выдадзеную нядаўна Дзяржаўным выдавецтвам палітычнай літаратуры. І гэта зразумела. У ёй шырока асвятляецца дзейнасць Саветаў і пастаянных камісій, іх барацьба за пабудову камуністычнага грамадства. Кніга ўвабрала багаты і цікавы фактычны матэрыял, на якім ляжыць адзнака злабадзённасці. Яна тым і каштоўная, што гутарка ў ёй ідзе не аб далёкім гістарычным мінулым, а пра веліч нашай эпохі, пра новых людзей, аб тых, хто сёння будуе камунізм.

Перагортваючы старонкі, мы сустракаем і імёны нашых знаёмых і землякоў. Хто з мінчан не ведае, скажам, дэпутата Мінскага гарадского Савета Фёдара Дзмітравіча Кулініча. Рознабаковая яго грамадская дзейнасць. Так, выконваючы наказы выбаршчыкаў, ён дабіўся кругласутачнага дзяжурства ўрачоў у амбулаторыі пасёлка камбіната будаўнічых матэрыялаў. Дзякуючы настойлівасці і нястомным клопатам дэпутата на камбінаце былі адкрыты дзіцячы сад, кніжны кіёск, ларок для продажу газы, абсталяваны два павільёны для пасажыраў на аўтобусных прыпынках. Фёдар Дзмітравіч заўсёды ў гушчыні людзей, разам з народам, працуе побач са сваімі выбаршчыкамі.

Высокім усведамленнем грамадскага абавязку прасякнута дзейнасць дэпутата Валожынскага раённага Савета Д. Д. Сівага і дэпутата Д. К. Гаўручонка з Барысава, старшыні пастаяннай камісіі па ахове здароўя Мінскага гарсавета Е. Е. Сярковай і многіх іншых.

Ярка і пераканаўча расказвае аўтар аб рабоце Вярхоўнага Савета Беларускай ССР. У выніку прынятых партыяй мер па расшырэнню правоў саюзных рэспублік Вярхоўны Савет БССР практычна пачаў вырашаць больш шырокае кола пытанняў палітычнага, гаспадарчага і культурнага будаўніцтва. Як указвае аўтар, дэпутаты актыўна абмяркоўвалі і вырашалі пытанні рэарганізацыі кіравання прамысловасцю і будаўніцтвам, перабудовы сістэмы народнай асветы, паляпшэння медыцынскага абслугоўвання насельніцтва, гандлю і грамадскага харчавання, аб стане і мерах па паляпшэнню бытавога абслугоўвання насельніцтва і іншыя. Узмацненне гаспадарча-арганізатарскай і культурна-выхаваўчай дзейнасці Вярхоўнага Савета, расшырэнне кола разглядаемых ім пытанняў актывізавалі работу пастаянных камісій.

Абмеркаванне заканадаўчых актаў шырокай грамадскасцю, удзел народных мас у заканадаўчай дзейнасці — заканамерныя з'явы нашай рэчаіснасці. Яны з'яўляюцца найярчэйшым выяўленнем сапраўднага дэмакратызму савецкага грамадства, усё больш шырокага непасрэднага ўдзелу працоўных у кіраванні справамі сваёй дзяржавы. Так, абмеркаванне тэзісаў даклада М. С. Хрушчова аб далейшым развіцці калгаснага ладу і рэарганізацыі машынна-трактарных станцый прыняло ў рэспубліцы, як і ва ўсіх іншых саюзных рэспубліках, сапраўды ўсенародны характар. На сходах у калгасах, МТС, саўгасах, на прамысловых прадпрыемствах і будоўлях прысутнічала больш паўтара мільёна чалавек, з іх больш 100 тысяч выступіла.

У адным з раздзелаў кнігі — «На шляху да грамадскага самакіравання» расказваецца аб развіцці грамадскіх асноў у дзейнасці Саветаў. Створаныя на грамадскіх асновах аддзелы выканаўчых камітэтаў Саветаў, інстытут няштатных інструктараў выканкомаў і іх аддзелаў, народныя грамадскія інстытуты, грамадскія саветы пры ўстано-

**М. ДОЎБІК,**
**кандыдат гістарычных навук.**

***З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў бібліятэцы***

Прэзідэнцкая бібліятэка Рэспублікі Беларусь